НЕДАКЛАДНАСЦЬ ЦІ ЗАСТАРЭЛЫЯ ПОГЛЯДЫ?

За гады Савецкай улады літаратуразнаўства, узброенае марксісцка-ленінскай тэорыяй, дасягнула вялікіх поспехаў. Усебакова даследаваны не толькі творчасць дарэвалюцыйных пісьменнікаў і сучасны літаратурны працэс. Савецкае літаратуразнаўства па-новаму асвятліла і перагледзела многія моманты гісторыі, грамадскія і літаратурныя з'явы мінулага ўвогуле і ў прыватнасці тых народаў, якія ва ўмовах царызму не прызнаваліся афіцыйнай навукай і не мелі належных умоў для развіцця нацыянальнай культуры. Крытыка і літаратуразнаўства многае зрабілі ў справе вывучэння і даследавання брацкіх літаратурных сувязей, садзейнічалі таму, каб творы Пушкіна і Горкага, Купалы і Коласа, Шаўчэнкі і Міцкевіча, Райніса і Руставелі і многіх іншых пісьменнікаў сталі зразумелымі і блізкімі многанацыянальнаму чытачу.

Таму вельмі прыкра, што часам застарэлыя нігілістычныя погляды буржуазных вучоных без належнага крытычнага асэнсавання пераносяцца ў савецкае літаратуразнаўства.

Нядаўна мне давялося пазнаёміцца з кнігай К. Осіпава «Рускі першадрукар Іван Фёдараў» (Вучпедвыд., Масква, 1955 г.). Калі ў многіх кнігах па гісторыі кнігадрукавання зусім замоўчваецца дзейнасць Георгія Скарыны, дык К. Осіпаў спрабуе даць некаторыя звесткі пра жыццё і працу беларускага першадрукара: «**У пачатку XV стагоддзя** кнігадрукаванне яшчэ больш наблізілася да граніц Расіі: у дваццатых гадах яно з'явілася ў Літве. Карэннае насельніцтва Літвы было праваслаўным... Галоўным дзеячом кнігадрукавання быў **тут** Георгі Скарына. Ураджэнец горада Полацка, **член** багатай **рускай** купецкай сям'і, Скарына закончыў Кракаўскі ўніверсітэт і пасля перасяліўся ў Прагу. Ён заснаваў у Празе (1517), а потым у Вільні друкарні і друкаваў царкоўныя кнігі: «Біблію», «Псалтыр» і інш. Гэтыя кнігі ён друкаваў на тагачаснай беларускай **гаворцы** (літоўска-рускі дыялект), на якую ён сам жа і перакладаў іх» (усюды падкрэслена мною.— *С. А.).*

Сказана пра Скарыну вельмі лаканічна, але і ў гэтых словах многа памылковага і недакладнага. Звесткі пра беларускага першадрукара ў кнізе К. Осіпава — гэта паўтарэнне застарэлых афіцыйных поглядаў буржуазнага літаратуразнаўства, якое адмаўляла існаванне беларускага народа, яго мовы і літаратуры.

Перш-наперш К. Осіпаў робіць фактычную памылку. Г. Скарына пачаў кнігадрукаванне ў 20-х гадах не XV стагоддзя, як сказана ў даследаванні, а XVI стагоддзя. Змешвае аўтар кнігі два вельмі розныя паняцці: этнаграфічную ўласна Літву і гістарычную Літву — тэрыторыю былога Вялікага княства Літоўскага. Але больш падрабязна пра гэта ніжэй.

Услед за некаторымі даследчыкамі XIX стагоддзя К. Осіпаў не лічыць Скарыну беларусам па паходжанню. Аўтару, які даследуе гісторыю грамадскай думкі і культуры ўсходнеславянскіх народаў у XVI—XVII стагоддзях, варта было б ведаць спецыфіку тэрмінаў «рускі», «руські» на Беларусі, якія ў часы Скарыны азначалі «праваслаўны», «мясцовы», «не паляк». К. Осіпаў чамусьці лічыць старажытную беларускую мову толькі гаворкай і робіць нават філалагічнае «адкрыццё»: мова выданняў Скарыны — гзта нібыта «літоўска-рускі дыялект». Шкада, што К. Осіпаў не заглянуў у Вялікую Савецкую Энцыклапедыю, якая дапамагла б яму разабрацца ў пытанні аб асаблівасцях тагачаснай беларускай кніжнай мовы: «У часе далучэння беларускіх зямель да Літвы беларуская культура была значна вышэй за літоўскую. Дзякуючы гэтаму беларуская мова стала афіцыйнай мовай Літоўскага княства. На гэтай мове у XIV і XV стагоддзях напісаны звод законаў Літвы — «Літоўскі статут», пісаліся юрыдычныя акты і перапісваліся перакладныя «жыціі» («Жыціе св. Аляксея, чалавека божыя» і інш.), гераічныя аповесці («Аб Троі», «Александрыя»), ствараліся ўласныя гістарычныя паданні, мясцовыя летапісы» (ВСЭ, том. 4, стар. 509).

Абыходзіць К. Осіпаў пытанне ўплыву скарынінскіх выданняў на развіццё кнігадрукавання на рускіх і ўкраінскіх землях. Толькі ў адным месцы ў кнізе зроблена ўскоснае прызнанне: «Як мы ведаем, у Беларусі Георгіем Скарыною быў закладзены трывалы фундамент для кнігадрукавання, і Мсціславец мог легка навучыцца друкарскай справе ў сябе на радзіме. Відаць, Фёдараў асабліва цаніў у ім добрага рэзчыка шрыфтаў і заставак». Выклікае здзіўленне, што ў XII раздзеле кнігі, дзе разглядаецца значэнне дзейнасці Івана Фёдарава, даследчык забывае пра Г. Скарыну і закладзены ім на Беларусі «трывалы фундамент для кнігадрукавання»: «У Расіі і на землях, заселеных людзьмі брацкіх народнасцей — украінскай і беларускай, **дзе дагэтуль не існавала кнігадрукавання** (падкрэслена мною.— *С.* А), значэнне падобнай дзейнасці (маецца на ўвазе праца І. Фёдарава.— *С. А.)* было асабліва вялікім». Калі К. Осіпаў наперакор ісціне ніяк не хоча лічыць Г. Скарыну беларускім першадрукаром па той прычыне, што ён друкаваў кнігі ў Празе і Вільні, дык даследчык

павінен ведаць, што ў Скарыны было многа паслядоўнікаў, якія займаліся друкарскай справай на беларускіх землях да таго, як разгарнулася дзейнасць Івана Фёдарава ў Маскве (у 1562 г. друкуе свае кнігі ў Нясвіжы С. Будны).

Бясспрэчна, дзейнасць І. Фёдарава мела вялікае значэнне для ўсходнеславянскіх зямель, у тым ліку і для Беларусі, але нельга адмаўляць і вялікага ўплыву,— як гэта робіць К. Осіпаў,— працы Скарыны на развіццё кнігадрукавання ў Расіі і на Украіне. Прыходзіцца зноў спасылацца на аўтарытэтнае выданне — Вялікую Савецкую Энцыклапедыю, дзе сказана, што дзейнасць Г. Скарыны «зрабіла вялікі ўплыў на культуру ўсіх славянскіх народаў» (ВСЭ, том 39, стар. 252). Друкарская дзейнасць Г. Скарыны сведчыць аб даўніх традыцыях узаемасувязей і братняга яднання беларускага і рускага народаў.

Апрача самога факту, што беларускі першадрукар пачаў кнігадрукаванне на роднай мове амаль на паўвека раней І. Фёдарава і гэтым прама ці ўскосна аказаў уплыў на развіццё рускага кнігадрукавання, чэшскі вучоны А. В. Фляроўскі ў даследаванні «Чэшская біблія ў гісторыі рускай культуры і пісьменнасці» («Зборнік філалагічны», том III, Прага, 1946 г.) прыводзіць цікавыя звесткі пра спробу Скарыны пачаць кнігадрукаванне ў Маскве. Беларускі друкар у канцы 20-х ці пачатку 30-х гадоў XVI стагоддзя ездзіў у Маскву, каб адкрыць там друкарню, але духавенства непрыхільна аднеслася да яго кніг, якія ён прывёз напаказ, і загадала іх спаліць.

Бяда была б невялікая, калі б такія памылковыя звесткі трапілі толькі на старонкі кнігі К. Осіпава «Рускі першадрукар Іван Фёдараў», якая выдадзена 75-тысячным тыражом як «дапаможнік для вучняў». Але ёсць яны і ў некаторых іншых даследаваннях па гісторыі кнігадрукавання. Е. Неміроўскі і Б. Гарбачэўскі ў працы «Нараджэнне кнігі» («Савецкая Расія», М., 1957 г.) вядомага беларускага друкара Васіля Цяпінскага лічаць украінскім дзеячом. Ёсць нават недакладнасці ў грунтоўным і цікавым даследаванні А. Сідарава «Старажытнаруская кніжная гравюра» (Выданне Акадэміі навук СССР, 1951 г.).

А. Сідараў у сваёй манаграфіі зрэдку ўспамінае працу Г. Скарыны і нават прызнае, што ў кнігах І. Фёдарава ёсць асобныя гравюры і ініцыялы — застаўныя літары, падобныя да скарынінскіх (стар. 95 і 112), але адначасова на старонцы 204 ён сцвярджае: «У XVI стагоддзі «масквіцін» Іван Фёдараў **прынёс** брацкім народам — **беларусам** і ўкраінцам — **кнігадрукаванне і гравюру»** (падкрэслена мною.— *С. А.).* Такія «вывады» выклікаюць здзіўленне ў тых, хто знаёмы з гісторыяй беларускага кнігадрукавання, з дзейнасцю Г. Скарыны, С. Буднага, В. Цяпінскага і інш.

Асобна трэба сказаць пра тэрміны «Літва» і «літоўскі», якія за шматвяковую гісторыю прайшлі значную эвалюцыю. Спачатку, у X—XIII стагоддзях, Літвой называлі паўднёва-ўсходнюю частку тэрыторыі сучаснай Літоўскай ССР, дзе жылі літоўскія плямёны. Пасля таго як літоўскія князі ў канцы XIII — пачатку XIV стагоддзя падначалілі сабе Беларусь, Літвой сталі называць і беларускія землі як частку Вялікага княства Літоўскага. У сучасны момант Літва — гэта Літоўская ССР, тэрыторыя, дзе жыве літоўскі народ.

Гэтая істотная асаблівасць і эвалюцыя тэрміна «Літва» не ўлічваюцца ў некаторых новых даследаваннях пра А. Міцкевіча, Л. Кандратовіча і іншых польскіх пісьменнікаў, жыццё і творчасць якіх звязана з Беларуссю. У пачатку і сярэдзіне XIX стагоддзя ў польскім друку ў разнастайных матэрыялах па гісторыі, этнаграфіі, фальклору і літаратуры шырока ўжываецца тэрмін «Літва» і «літоўскі» ў значэнні «Беларусь» і «беларускі».

У такой тэрміналогіі была пэўная палітычная тэндэнцыя. Польскія нацыяналісты, якія марылі аб адраджэнні Польшчы «ад мора да мора» ў межах да 1772 г., ніяк не маглі змірыцца з тым, што беларускія і ўкраінскія землі ўвайшлі ў склад Расіі. Таму нават тэрмін «Беларусь» ім быў не да спадобы, бо ён сведчыў, што гэта Русь, хоць і Белая. Прызнанне тэрміна «Беларусь» азначала прызнанне таго, што беларускі народ сваей мовай, культурай блізка звязаны з Руссю і рускім народам, з чым ніяк не маглі прымірыцца польскія нацыяналісты. Таму замест «Беларусь» і «беларускі» ў польскім друку ў XIX стагоддзі шырока ўжываліся тэрміны «Літва», «літоўскі», «крывіч», «крывіцкі», «крывічанскі» і інш.

Такая тэрміналогія стала паступова ўкараняцца ў геаграфіі (Мінск-Літоўскі, Брэст-Літоўскі, Літоўскае Палессе), пранікаць у літаратуру. Вялікі польскі паэт А. Міцкевіч, аддаючы даніну часу, называе сябе літвінам, у польскім друку нават Дуніна-Марцінкевіча па паходжанню лічыць літвінам (А. Плуг — верш-прысвячэнне «В. Марцінкевічу»).

«Літва — айчына мая», - пачынае А. Міцкевіч сваю славутую паэму «Пан Тадэуш», называючы радзімыя навагрудскія ваколіцы Літвой. У многіх паэтычных творах, пісьмах і паасобных выказваннях польскі паэт называе Беларусь Літвою. Аб тым, што, ужываючы гэты тэрмін, А. Міцкевіч меў на ўвазе родныя беларускія мясціны — Навагрудчыну, сведчаць яго пісьмы да

таварыша па Віленскаму ўніверсітэту— І. Дамейкі. У лісце, датаваным 23 чэрвеня 1830 г., А. Міцкевіч пісаў: «Зразумела, што калі я мару пра Літву, то перш за ўсё думаю толькі пра некаторыя мясціны...» У другім лісце паэт тлумачыць, якія іменна мясціны ён мае на ўвазе: «Часта нападае на мяне цяжкая туга па Літве, і я ўвесь час бачу ў сне **Навагрудак і Туганавічы»** (падкрэслена мною.— *С, А.).* Трапіўшы ў Канстанцінопаль, польскі паэт параўноўвае вуліцы турэцкага горада з вуліцамі Навагрудка — свайго «роднага мястэчка ў Літве» (ліст В. Хлюсцінай, 25 кастрычніка 1855 г.).

Аб тым, што паэт называў Беларусь Літвой, сведчаць яго выказванні аб беларускай мове. У артыкуле «Францішак Карпінскі» А. Міцкевіч робіць такую зноску: «Просты народ у Літве размаўляе на русінскай гаворцы...» У сваіх «Лекцыях аб славянскіх літаратурах» паэт тлумачыць, што беларускую мову называюць яшчэ «русінскай або літоўска-русінскай» (лекцыя 21 студзеня 1842 г.).

Многія савецкія даследчыкі творчасці А. Міцкевіча, трымаючыся літары, відаць, не разумеюць сэнсу, які ўкладваў паэт у паняцце «Літва». У шматлікай літаратуры на рускай мове (артыкулах, прадмовах, заўвагах да твораў А. Міцкевіча) няма правільнага тлумачэння паняцця Літва ў творах вялікага паэта. Прачытаеш такі артыкул ці прадмову — і атрымліваецца, што Міцкевіч нарадзіўся ў Літве, у Навагрудку чуў **літоўскія** песні, падзеі, апісаныя ў паэме «Гражына», адбываюцца ў Літве, у паэме «Пан Тадэуш» паэт апісвае жыццё **літоўскага** засценка і паказвае прыроду **Літвы.**

А. Міцкевіч быў вялікім польскім паэтам, але жыццё і творчасць яго цесна звязаны з беларускай народнай творчасцю, гісторыяй, бытам і прыродай Беларусі. Гэтая акалічнасць не вельмі падабалася некаторым польскім даследчыкам творчасці А. Міцкевіча. Таму становіцца вельмі дзіўна і крыўдна за тых савецкіх літаратуразнаўцаў, якія без крытычнага асэнсавання і тлумачэння паўтараюць застарэлую тэрміналогію, ад якой даўно адмовіліся сучасныя польскія даследчыкі.

А чаму не сказаць проста і ясна, што А. Міцкевіч нарадзіўся на **Беларусі,** з маленства чуў беларускія і польскія песні? Дзеянне ў паэме «Гражына» адбываецца ў Навагрудку, а «Пан Тадэуш» — гэта рэалістычныя малюнкі жыцця і побыту беларуска-польскай шляхты? Чаму не сказаць, што ў паэме «Пан Тадэуш» паказана прырода не Літвы, а Беларусі? Кашалёўскія лясы, Плужынская пушча, Варонча, Чамброва, Пуцэвічы, Карэлічы, Туганавічы, якія ўпамінаюцца ў паэме,— усё гэта навагрудскія ваколіцы, пейзажны фон паэмы.

Гэта трэба сказаць і таму, што масавы савецкі чытач, для якога Літва сёння — гэта Літоўская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, будзе мець памылковае ўяўленне аб вытоках творчасці А. Міцкевіча. Дзіўна, што ні ў пяцітомніку выбраных твораў паэта, ні ў прадмовах да паасобных выданняў, ні ў манаграфічных даследаваннях пра А. Міцкевіча няма правільнага тлумачэння паняцця Літва ў творчасці польскага песняра. Нават у вялікай рабоце М. Жывава «Адам Міцкевіч», якая налічвае 590 старонак, не знайшлося месца для тлумачэння гэтага тэрміну, вельмі важнага для разумення творчасці вялікага польскага паэта. М. Жываў таксама піша, што ў паэме «Пан Тадэуш» паказаны **«літоўскі** засценак», «прырода **Літвы», «літоўскі** лес» і г. д.

Аналагічны недахоп адчуваецца ў кнізе І. Горскага «Адам Міцкевіч» (Выдавецтва Акадэміі навук СССР, Масква, 1955 г.), у многіх падручніках па зарубежнай літаратуры. Толькі ў кнізе А. Міцкевіча «Выбраныя творы» (Дзяржвыдат дзіцячай літаратуры, 1956 г.) М. Рыльскі ў прадмове тлумачыць, што «Міцкевіч называў сваёй радзімай Літву, але працоўны народ, сярод якога ён правёў свае дзіцячыя і юнацкія гады, быў народ беларускі».

Цесна звязана з беларускім фальклорам і жыццём беларускага народа творчасць другога польскага паэта У. Сыракомлі (Л. Кандратовіча). Іншай думкі, відаць, трымаецца В. Арцімовіч у прадмове да кнігі выбраных твораў польскага паэта (Дзяржлітвыдат, 1953 г.). Ні ў біяграфіі У. Сыракомлі, ні ў разглядзе яго творчасці В. Арцімовіч ні разу нават не ўспамінае слова «Беларусь» і «беларускі», усюды ў яго застарэлая тэрміналогія — «Літва», «літоўскі». Аўтар прадмовы піша, напрыклад, аб тым, што У. Сыракомля ў Кудзінавічах і Нясвіжы «пазнаёміўся з польскімі і **літоўскімі** народнымі песнямі». Польскі паэт займаўся творчай апрацоўкай народных песень («Груган», «Доля», «Песенька літоўскай сялянкі», «Народная песня»), аднак у зборніку яны маюць толькі падзагаловак: «Літоўская песня» без адпаведных тлумачэнняў.

Для У. Сыракомлі паняцце **«літоўская** песня» было раўназначным паняццю «беларуская песня». Аб гэтым сведчыць вельмі пераканаўчы факт: сам паэт неаднаразова адзначаў, што ўласна літоўскай мовы ён не ведае. У адным з лістоў ён пісаў: «Толькі мая бяда ў тым, што я не ведаю па-літоўску» [1]. Пра тэта У. Сыракомля кажа і ў кнізе «Wycieczki po Litwie w promieniach od Wilna»:

---

[1] *J- I. Kraszewski.* «Wl. Syrokomla», 1863 г., стар. 225.

«На вуліцы бегалі дзяўчаты і дзеці і штосьці гаварылі на літоўскай мове, на жаль, незразумелай нам» (том. 1, стар. 134).

Мы закранулі толькі два пытанні, дзе трапляюць недакладнасці і праяўляюцца застарэлыя гюгляды на гісторыю і літаратуру беларускага народа, аднак яны наглядна сведчаць, што вывучэнне творчых сувязей патрабуе не толькі ведання фактаў, але і правільнага асэнсавання іх, перагляду застарэлай традыцыі.